View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by BSU Digital Library



**Сяргей Шафаловіч**
*Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт*

# НОВЫ САЙТ «УНІВЕРСІТЭТА» ВЫХОДЗІЦЬ У САЦЫЯЛЬНЫЯ СЕТКІ

У сучаснай інфармацыйнай прасторы існаванне традыцыйных друкаваных СМІ ўжо немагчыма без наяўнасці функцыянальнага электроннага дадатка. Пазначаная тэндэнцыя закранула і карпаратыўныя выданні, да якіх адносіцца і газета БДУ «Універсітэт».

У лютым 2014 года сайт газеты «Універсітэт» www.gazeta.bsu.by набыў новы дызайн і стаў больш лёгкім для ўспрымання наведвальнікаў. Змены закранулі не толькі вонкавы выгляд. Новы вэб-рэсурс у параўнанні з папярэднім не супадаў цалкам з друкаваным выданнем. На сайце ў рэжыме рэальнага часу пачалі публікавацца матэрыялы і артыкулы, якія рэдакцыя не заўсёды мела магчымасць размяшчаць у друкаванай версіі. Побач з кожным артыкулам паказваецца час яго размяшчэння. Гэта дазваляе ў рэжыме анлайн заўсёды заставацца ў курсе найбольш значных падзей, якія адбываюцца ў БДУ.

Пры распрацоўцы канцэпцыі рэсурса быў улічаны вопыт вядучых беларускіх і замежных інтэрнэт-СМІ. У верхняй частцы размешчана слайд-шоу. Там знаходзяцца найбольш важныя публікацыі кожнага нумара. Асабліва прапрацавана лінейка меню пад шапкай сайта, пад вылучанымі кнопкамі размешчана канкрэтная і карысная інфармацыя. Абноўленая навігацыя эканоміць час чытача і канцэнтруе яго ўвагу на самым галоўным.

Значная ўвага нададзена візуалізацыі. На сайце www.gazeta.bsu.by можна, у тым ліку, убачыць фотагалерэі і відэаматэрыялы пра жыццё БДУ. Кожны ахвотны можа пакінуць свае каментары да публікацый на сайце. Прычым папярэдняя мадэрацыя адсутнічае. На сайце ёсць новыя раздзелы «Свежыя каментары», «Цікавыя абмеркаванні», «Самае папулярнае». Сайт цалкам інтэграваны з вядучымі сацыяльнымі сеткамі «ВКонтакте», «Facebook» і «Twitter». У раздзеле «Сацыяльныя медыя» маюцца спасылкі на акаўнты БДУ ў сацыяльных сетках. Пад кожнай публікацыяй знаходзяцца кнопкі, з дапамогай якіх можна падзяліцца цікавым кантэнтам з сваімі сябрамі.

У сярэдзіне 2015-га года сайт газеты «Універсітэт» быў яшчэ больш мадэрнізаваны. Для лепшага ўспрыняцця яго вонкавы выгляд набыў шырокі фармат і быў стылізаваны пад фірмовыя колеры БДУ. Палепшылася навігацыя па сайце. Да дадатковых магчымасцяў новага сайта www.gazeta.bsu.by можна аднесці дынамічны і адаптыўны дызайн, які

забяспечвае выдатнае адлюстраванне кантэнту на экранах смартфонаў і планшэтаў. На сайце маецца архіў нумароў газеты ў PDF фармаце, прычым нумары газеты за 2010–2014-я гг. інкарпараваныя ў электронную бібліятэку БДУ. Газета БДУ мае ўласны QR-код для зручнага счытвання ўсімі мабільнымі прыладамі і прапануе шмат карысных сервісаў для чытачоў з рознымі інтарэсамі.

Больш ілюстратыўнай стала падача матэрыялаў. Увогуле значная частка публікацый на сайце мае выразны канвергентны характар, то бок тэкставы складнік дапаўняецца адпаведным відэа і шырокім фотакантэнтам. У асобных выпадках прысутнічаюць слайды і інфаграфічныя элементы. У планах рэдакцыі рэгулярна праводзіць апытанні сярод выкладчыкаў і студэнтаў наконт удасканалення сайта і паляпшэння зместу матэрыялаў.

«Думаю, што новы сайт www.gazeta.bsu.by у поўнай меры адпавядае тым задачам, якія стаяць перад БДУ ў інфармацыйнай дзейнасці, – лічыць Аляксандр Градзюшка, адзін з распрацоўшчыкаў новай канцэпцыі сайта “Універсітэта”, дацэнт кафедры тэорыі і метадалогіі журналістыкі – вэб-рэсурс можа стаць адным з лідараў на інфармацыйным полі ВНУ. Праўда, толькі ў тым выпадку, калі гэта сучаснае інтэрнэт-СМІ будзе прадастаўляць чытачам якасны і карысны кантэнт і будзе інтэгравана з папулярнымі сацыяльнымі медыя».

У гэтым накірунку мы дасягнулі значнага прагрэсу. Адразу пад шапкай сайта размешчаны банер суполкі БДУ ў «ВКонтакте». Практычна ўсе новыя матэрыялы газеты аператыўна выстаўляюцца ў «сцяну» і набываюць істотны рэзананс. Тое ж тычыцца і верагодных ініцыятыў рэдакцыі (паэтычныя і фатаграфічныя конкурсы і т. п.). Праз мадэратараў сацыяльных сетак Медыяцэнтра БДУ мы таксама добра прадстаўлены ў «Instagram» і «Facebook».

Характэрная рыса газеты «Універсітэт» на працягу ўсяго існавання – беларускамоўнасць выдання. Гэтай адметнасці мы прытрымліваемся і на сайце выдання. Пры гэтым усяляк імкнемся ствараць аўтэнтычны кантэнт. Шмат відэа выкарыстоўваецца з канала БДУ на «Youtube», які таксама інтэграваны ў сайт. Мы пакуль адмовіліся ад RSS-навін, бо яны аддцягваюць карыстальнікаў з сайта. У напісанні матэрыялаў задзейнічаны шмат дасведчаных студэнтаў журфака, пэўную працу робяць і практыканты, якіх у нас таксама багата.

Акрамя саміх матэрыялаў, тэматыку якіх мы ўсяляк пашыраем, на сайце прадстаўлены спецпраекты, студэнцкая прэса, спасылкі на карысныя рэсурсы, аб’явы пра вакансіі і юбілеі, агляд публікацый

рэспубліканскіх СМІ, сучасная беларуская музыка, паэтычная старонка, сацыяльныя ролікі, займальныя анекдоты (на студэнцкую тэматыку) і цытатнік вядомых беларускіх дзеячоў. Наша галоўная місія – стварыць цікавы беларускамоўны рэсурс, каб арганічна паказаць жыццё вядучай айчыннай ВНУ і паўплываць на развіццё самасвядомасці найперш моладзі, якой патрэбныя моцныя гістарычныя карані. «Універсітэт» няўхільна развіваецца разам з грамадствам і альма-матар.

**Виктор Шимолин**
*Белорусский государственный университет*

## ФОТОМОНТАЖ КАК ЖАНР ДОКУМЕНТАЛЬНОГО ИСКУССТВА

Фотография позаимствовала у живописи не только ее жанры, но и создала новый – фотомонтаж, который на протяжении своей истории не только сохраняет документальную природу фотографии, но и является произведением искусства. Если газетные портреты, пейзажи и натюрморты изначально служили реальным подтверждением новостных сообщений о знаменательных событиях, то фотомонтаж позволял с помощью фотографий, клея и ножниц интерпретировать факты в соответствии с идеей автора. Появление жанра определялось не только желанием создать новый вид изобразительного искусства или удивить читателя диковинной композицией, но и попыткой исправить ошибки при фотосъемке.

Одним из первых и наиболее ярких мастеров фотомонтажа считается Густав Рейландер (1813–1875), поразивший современников работой «Два образа (пути) жизни» (1857), созданной из тридцати фотографий. Эту дату, скорее всего, и можно считать отправной точкой рождения нового фотографического жанра, соединившего документальную и художественную функции фотожурналистики.

Газетная публицистика востребовала фотомонтаж как средство отражения сложных социальных, политических и экономических процессов середины XIX в. Наиболее яркий след в искусстве фотомонтажа оставили Ханна Хёх, Джон Хартфильд, Рауль Хаусманн, Макс Эрнст, Л. Мохой-Надь, Александр Родченко, Эдуард Лисицкий, Юрий Рожков, Густав Клуцис [2].

Приверженцы жанра объединялись в кружки, секции и группы с целью выразить в причудливых композициях собственные мысли, чувства